Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

Кафедра беларускай мовы і літаратуры

УЗГОДНЕНА

Загадчык кафедры
_______________
«18» 04 2023г.

# ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ

Для спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці) 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)»

Складальнік:

Воінава-Страха М. М.

Свидетельство о государственной регистрации ИР
№ 1142334762 от 13.06.2023 г.

Доступ к интерактивному ресурсу по ссылке:
https://moodle.mslu.by/course/view.php?id=2215

Абмеркавана і разгледжана на пасяджэнні
Навукова-метадычнага савета МДЛУ
«26» 04 2023г., пратакол № 8

Уводзіны

Электронны вучэбна-метадычны комплекс распрацаваны на аснове вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай” для спецыяльнасці 1-02 03 08 “Замежная мова (з пазначэннем мовы)”.

Мэтай ЭВМК з’яўляецца павышэнне эфектыўнасці аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў шляхам метадычнага забеспячэння засваення і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу ў працэсе вывучэння дысцыпліны і падрыхтоўкі да выніковай атэстацыі.

Задачы ЭВМК:

– забяспечыць адукацыйны працэс неабходнымі вучэбна-метадычнымі матэрыяламі для засваення ведаў пра адметнасці развіцця беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай, неабходных у прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

– сфарміраваць сістэму ведаў пра заканамернасці развіцца літаратуры Беларусі ў кантэксце агульнаславянскага і агульнаеўрапейскага літаратурна культурнага ўзаемадзеяння;

– выпрацаваць навыкі аналізу літаратурных тэкстаў, параўнальна супастаўляльнага вывучэння літаратурных з’яў;

– удасканаліць веды пра беларускае пісьменства XI – пачатку XXI стст. у кантэксце сусветнага літаратурнага развіцця;

– сфарміраваць разуменне нацыянальнай спецыфікі, ідэйна-мастацкіх асаблівасцей беларускай літаратуры, усведамленне яе месца ў сусветным літаратурным працэсе, канкрэтызацыя міжлітаратурных сувязей.

ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай” змяшчае неабходныя матэрыялы для лекцыйных заняткаў і самастойнай работы, мэтай якіх з’яўляецца арганізацыя суправаджэння адукацыйнага працэсу.

ЭВМК уключае наступныя структурныя кампаненты: тэарэтычны, практычны, дапаможны раздзелы, раздзел кантролю ведаў.

**Інструкцыя карыстальніка электронным вучэбным выданнем**

ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай” прызначаны для студэнтаў 2 курса МДЛУ, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-02 03 08 “Замежная мова (з пазначэннем мовы)”.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы да лекцыйных заняткаў, пры індывідуальным засваенні матэрыялу студэнтамі.

Пры працы са структурнымі кампанентамі ЭВМК рэкамендуецца ўлічваць наступныя моманты.

У тэарэтычным раздзеле прадстаўлены матэрыял па асноўных перыядах развіцця літаратурнага працэсу: беларуская літаратура Сярэднявечча ў сістэме літаратурных узаемасувязяў, Рэнесанс у Еўропе і Беларусі, літаратурнае барока 3 ў Еўропе і Беларусі, новая беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай, беларуская літаратура 1920-30-х гадоў і мадэрнізм, беларуская літаратура другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя і сусветны літаратурны працэс

1. Тэарэтычны матэрыял падаецца ў адпаведнасці з функцыянальнай абумоўленасцю і практычнай скіраванасцю.

2. Практычны раздзел змяшчае матэрыял для самастойнай работы студэнтаў, якія маюць на мэце замацаваць тэарэтычныя веды, выпрацаваць навыкі кампаратыўнага аналізу літаратурных тэкстаў, параўнальна супастаўляльнага вывучэння літаратурных з’яў. Матэрыял практычнага раздзела ўключае пералік актуальных літаратурных крыніц для самастойнай падрыхтоўкі, метадычныя рэкамендацыі па напісанні рэферата, эсэ, распрацоўкі гласарыя, мультымедыйнай прэзентацыі, прыкладны спіс тэм і крытэрыі ацэнкі пералічаных відаў работы. Пры выкананні заданняў можна звярнуцца да адпаведнага тэарэтычнага матэрыялу, а таксама праверыць правільнасць яго засваення шляхам выканання тэстаў.

3. Раздзел кантролю ведаў, у якім размешчаны тэсты, што дазваляюць праверыць ступень засваення тэарэтычных ведаў і выпрацоўкі практычных навыкаў, прыкладны пералік пытанняў да заліку, а таксама крытэрыі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнта пры праходжанні бягучай атэстацыі. Структурна заданні ў тэстах складзены з апорай на тэарэтычны і практычны матэрыял, які неабходна засвоіць пры вывучэнні той ці іншай тэмы згодна з вучэбнай праграмай.

4. Дапаможны раздзел, які прадстаўлены вучэбнай праграмай дысцыпліны (зместам вучэбнага матэрыялу, вучэбна-метадычнай картай і інфармацыйна-метадычнай часткай), спісам літаратуры. Працу па засваенні пэўнай тэмы рэкамендуецца пачынаць з вывучэння матэрыялу адпаведнага тэарэтычнага раздзела, звяртаючыся, пры неабходнасці, да зместу дапаможнай часткі. Выконваць заданні для самастойнай работы неабходна у прадстаўленай паслядоўнасці згодна з графікам самастойнай работы з апорай на тэорыю. У раздзеле кантролю ведаў з мэтай комплекснага замацавання вывучанага матэрыялу, пашырэння ведаў і самаадукацыі прадугледжаны тэсты, якія выконваюцца на платформе СЭН Moodle пасля засваення тэорыі і выканання заданняў для самастойнай работы.